В изучаемых нами учебниках имеется 43 упражнения, направленных на развитие связной речи учащихся, пополнение их лексического запаса.

Концепт «Родина» представлен в учебниках наиболее часто текстами художественного стиля. Далее следуют публицистический, научный. В тексте официально-делового стиля концепт представлен лишь единожды. Тексты разговорного стиля по изучаемому вопросу не были найдены.

Как показало наше исследование, в учебниках по русскому языку раскрытие концепта «Родина» происходит с помощью разных заданий, которые формируют целостное развитие учащихся, культурное и социокультурное формирование личности. Вместе с тем нами было обнаружено, что если в учебниках 5—6 классов достаточно много заданий для работы над концептом «Родина», то в 7—9 классах количество заданий гораздо меньше.

**Заключение.** Таким образом, выдвинутая в начале работы гипотеза подтвердилась: учебники по русскому языку в 5—9 классах содержат достаточно разнообразный материал для работы с концептом «Родина» с целью формирования социокультурной компетенции учащихся, их гражданской позиции.

Данная работа имеет практическое значение, поскольку собранный материал можно использовать на уроках русского языка в 5—9 классах. Полученные результаты убеждают в значимости концепта «Родина» для каждого учащегося. Интересным, на наш взгляд, будет исследование концепта «Родина» на примере учебных пособий по другим учебным предметам.

**Список цитируемых источников**

1. *Перевозчикова, А. К.* Концепт «Родина» как составляющая национального образа России в русской языковой картине мира [Электронный ресурс] / А. К. Перевозчикова // Концепт МГИМО. — Режим доступа: https:// concept.mgimo.ru. —Дата доступа: 17.09.2021.

2. *Рогожникова, Т. П.* Актуализация периферийных признаков концепта «Родина» (на материале педагогического дискурса начала XXI века) [Электронный ресурс] / Т. П. Рогожникова // Суперленинка. — Режим доступа: https:// cyberleninka.ru/article/n/aktualizatsiya-periferiynyh-priznakov-kontsepta-rodina-na-materiale-tekstov-pedagogicheskogo-diskursa-nachala-xxi-veka. — Дата доступа: 17.09.2021.

3. *Гимаев, Я. А.* Актуализация концепта «Родина» в сознании школьников и студентов [Электронный ресурс] / Я. А. Гимаев // Вест. МГУ. — Режим доступа: https:// vestnik-mgou.ru/Articles/Doc/2967. — Дата доступа: 17.09.2021.

4. *Попова, З. Д.* Понятие «концепт» в лингвистических исследованиях / З. Д. Попова, И. А. Стернин. — Воронеж : ВГУ, 2000. — 30 с.

5. *Ушаков, Д. Н.* Толковый словарь современного русского языка / Д. Н. Ушаков. — М. : Просвещение, 2014. — 800 с.

6. *Ожегов, С. И.* Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов, Н. Ю. Шведова. — М. : АСТ, 2020. — 736 с.

7. *Гаврилова, А. С.* Словарь синонимов и антонимов современного русского языка / А. С. Гаврилова. — М. : Аделант, 2014. — 513 с.

8. Словарь синонимов-онлайн [Электронный ресурс] // Синоним. — Режим доступа: https://sinonim.org/s/родина#list-s . — Дата доступа: 21.09.2021.

УДК 821.161.3.09

**В. І. Патаповіч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ У ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Уводзіны**. Пад нацыянальнай самасвядомасцю прынята разумець «сістэму поглядаў і ідэй, на аснове якіх адбываецца вылучэнне народам сябе з этнічнага свету, усведамленне асноўных рыс і асаблівасцяў свайго і іншых этнасаў» [1, с. 25].

Развіццё нацыянальнай самасвядомасці — з’ява складаная і дастаткова працяглая, непасрэдна звязаная з эвалюцыяй самога народа. Кожнае новае пакаленне імкнецца пераасэнсаваць асаблівасці сваёй супольнасці, сфарміраваць нацыянальную свядомасць у сувязі з сучасным светам. Праблема фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў застаецца актуальнай і на сучасным этапе развіцця грамадства. Літаратура з’яўляецца адным з галоўных сродкаў фарміравання самасвядомасці. На прыкладзе твораў беларускіх пісьменнікаў можна вылучыць адметнасці беларускага народа, прасачыць этапы станаўлення беларускай нацыі і яе развіццё ў розныя часы.

**Асноўная частка.** Асэнсаванне беларусамі сваёй прыналежнасці да асобнага этнасу прайшло шматлікія выпрабаванні. Складанасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці была звязана з палітычнымі, ідэалагічнымі, сацыяльна-культурнымі пытаннямі. Умоўна гэты працэс даследчыкі раздзяляюць на перыяды, якія адлюстроўваюць асноўныя характарыстыкі нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. У дадзеным артыкуле разглядаецца перыяд фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў канца XIX — пач. XX ст.

У другой палове XIX ст. упершыню ўзнікла пытанне аб самастойнасці беларускай мовы. Старабеларуская мова выкарыстоўвалася ў сялянскім асяроддзі, часткова гарадскім насельніцтвам і збяднелай шляхтай. Дзякуючы плённай дзейнасці Я. Чачота, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, гутарковая мова набыла статус літаратурнай. Актыўнае выкарыстанне беларускай мовы пачалося напрыканцы XIX ст. і знайшло сваё адлюстраванне ў творах такіх беларускіх дзеячаў як Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч. Стварэнне самастойнай літаратурнай мовы, народ з уласнай адметнай культурай з’яўляюцца асновай для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

© Патаповіч В. І., 2022



Рэпазіторый БарДУ

М. Багдановіч і яго паплечнікі добра разумелі значэнне нацыянальнай мовы для свайго народа і дабіваліся таго, каб родная мова ўвайшла ва ўсе сферы жыцця. Увазе да трагізму матчынай мовы паэт прысвяціў адзін са сваіх найбольш пранікнёных вершаў : *«Народ, Беларускі Народ! / Ты — цёмны, сляпы, нібы крот. / Табою ўсягды пагарджалі, / Цябе не пушчалі з ярма / І душу тваю абакралі, — / У ёй нават мовы няма»* [2, с. 294]. Для ўсіх народаў нацыянальная мова — гэта форма іх духоўнай культуры. Нездарма М. Багдановіч так радаваўся кожнаму сапраўднаму таленту, як вырастаў на гэтай ніве, садзейнічаў папулярызацыі яго твораў у масах, добра ведаючы, што гэта не толькі дапаможа ім стаць больш адукаванымі і культурнымі, але і заняць актыўную пазіцыю ў справе беларускага адраджэння.

Паэт пражыў надзвычай плённае ў творчых адносінах жыццё. Ён дасягнуў шырокага прызнання сучаснікаў і нашчадкаў. Яго творчая спадчына — істотная частка духоўнай культуры беларускага народа. З яго дзейнасцю звязана ідэйна-эстэтычнае і жанравае ўзбагачэнне нацыянальнай літаратуры. І, што надзвычай важна, М. Багдановіч быў сярод тых асоб нацыянальнай культуры, хто імкнуўся асэнсаваць месца і ролю свайго народа ў гісторыі і часе, шляхі яго далейшага развіцця, сфармуляваць нацыянальную ідэю беларусаў.

У свой час пісьменнік У. Караткевіч задаў пытанне: чаму і сёння М. Багдановіч застаецца для нас «ледзь не самай сімпатычнай і роднай постаццю ў гісторыі беларускай літаратуры?» — і даў на яго такі адказ: «Па-першае, ён большую частку жыцця не бачыў Радзімы, а калі ўбачыў, то спустошаную і знявечаную вайной. Па-другое, ён быў сумленным творцам, цвёрда ішоў па шляху «годнасці і сцвярджэння права на сваю незалежную думку. Па-трэцяе, ён бараніў годнасць чалавечую, клікаў да гуманізму і на гэтай дарозе адступленняў не ведаў. Па-чацвёртае, быў наскрозь гістарычным паэтам, абуджаў у народзе гістарычнае мысленне, а значыць, і гонар» [3, с. 235].

Любоў да Беларусі, яе народа прайшла праз жыццё паэта і знайшла адлюстраванне ў шматлікіх артыкулах («Глыбы і слаі», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці») і літаратурных творах (нізка вершаў «Старая Беларусь», цыкл «Места»).

М. Багдановіч прытрымліваўся думкі, што развіццё нацыянальнай самасвядомасці народа немагчыма без ведання сваёй гісторыі. Паэт разглядаў гісторыю ў розныя часы. Асабліва цікавіў яго перыяд Вялікага княства Літоўскага. У гэтай дзяржаве, пісаў М. Багдановіч, беларускі народ «развіваўся, як і раней, на старым корані, вытвараючы такім парадкам культуру, незалежную ад культуры велікарускай і з самага ж пачатку адражняўшуюся ад яе. Адным з бакоў гэтага развіцця быў узрост беларускай пісьменнасці, каторая з таго часу патроху становіцца на пэўны грунт» [4, с. 155]. Нізка «Старая Беларусь» з’яўляецца позіркам паэта ў мінулае краіны, жаданнем зведаць «аб прадзедах сваіх, — аб горы, радасцях і аб прыгодах іх». У гэтай нізцы паказваецца і вобраз селяніна, і думы, і пачуцці адданага народу інтэлігента — самога паэта. Гісторыя, легенды, паданні, складзеныя беларусамі, гаварылі паэту аб іх адвазе, гераізме, мужнасці («Нашых дзедаў душылі абшары лясоў», «Песня пра князя Ізяслава Полацкага»).

Цэнтральным у творчасці М. Багдановіча з’яўляўся паказ простага, працоўнага селяніна-мужыка. У вобразе мужыка раскрываўся і сам вобраз народа, абуджанага рэвалюцыяй 1905 г. Мужык гэты быў бедны і цёмны, але ў ім ужо будзілася годнасць чалавека, пачуццё нацыянальнай самасвядомасці, ён пачынае адчуваць сябе часткай цэлага народа. За спінай гэтага селяніна і стаіць гісторыя. М. Багдановіч як бы гаворыць сваімі вершамі, што за простымі людзьмі стаіць не хто-небудзь, а славуты першадрукар доктар лекарскіх навук Ф. Скарына (верш «Безнадзейнасць»), вялікая культура кнігапісання (вершы «Летапісец», «Перапісчык»), вялікае мастацтва і культура («Слуцкія ткачыхі»).

**Заключэнне.** Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці народа застаецца актуальнай тэмай на сучасным этапе развіцця грамадства. Разуменне народам сябе як нацыі магчыма праз шэраг фактараў: адзіная мова, культура, гісторыя. Творчасць М. Багдановіча стала ўзорным прыкладам адлюстравання самасвядомасці беларускага народа. Беларускі паэт актыўна прымаў удзел у культурна-адраджэнскім руху і змагаўся за прызнанне беларусаў як самастойнай нацыі.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Вонсович, Л. В.* Белорусоведение : учеб. пособие / Л. В. Вонсович. — Минск : ТетраСистем, 2005. — 224 с.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. — Мінск : Бел. навука, 1999. — Т. 1. — 583 с.
3. *Караткевіч, У.* Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч ; падрыхтоўка тэкстаў, каментарыі А. Вераб’я, Г. Кажамякіна ; рэд. тома А. Бельскі. — Мінск : Маст. літ., 2020. — Т. 19. Лісты. Ч. 1. — 606 с.
4. *Лыч, Л.* Беларуская мова і нацыя : літ.-гістарыч. арт. / Л. Лыч. — Мінск : Маст. літ., 1994. — 277 с.